ЛІТАРАТУРА:
1. Рагойша, В. Паэтычны слоўнік / В. Рагойша. – 3-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск, 2004. – 576 с.
2. Аўрамчык, М. Анкета: выбраныя вершы, паэмы, успаміны / М. Аўрамчык. – Мінск : Мастацкая ліаратура, 1990. – 447 с.
3. Аўрамчык, М. Запрашэнне да роздуму: вершы / М. Аўрамчык. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – 94 с.

# ТВОРЧАЯ СПАДЧЫНА ЯКУБА КОЛАСА

**Кіскевіч П. В.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
Навуковы кіраўнік – Варанец В. І.

Імя народнага паэта Беларусі Якуба Коласа – Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча – класіка беларускай літаратуры, добра вядома не толькі ў нашай краіне, але і далека за яе межамі. Яго творы перакладзены больш чым на сорак моў свету. Разам з Янкам Купалам ён стаяў каля вытокаў беларускай літаратуры.

Будучы паэт нарадзіўся 3 лістапада 1882г. у засценку Акінчыцы былога Мінскага павета. Пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі працаваў настаўнікам на Палессі. За ўдзел у нелегальным настаўніцкім з’ездзе ў 1906 г. Я. Колас быў асуджаны на тры гады. Пасля вызвалення 1912г. выкладаў у Пінскім 3-м прыходскім вучылішчы. Летам 1913 г. Я.Колас ажаніўся з настаўніцай Марыяй Дзмітрыеўнай Каменскай.

У 1921 г. Я.Колас з сям’ёй пераехаў у Мінск, працаваў у розных установах асветы. У 1926 г. ён атрымаў званне народнага паэта Беларусі. У 1928 г. Я.Колас стаў акадэмікам АН БССР, з 1929 – член яе Прэзідыума, потым- віцэ-прэзідэнт.

Упершыню верш Я.Коласа “Наш родны край” быў надрукаваны ў газеце “Наша доля” ў 1906 г. за подпісам “Якуб Колас”, Канстанцін Міцкевіч выкарыстоўваў і іншыя псеўданімы, але толькі “Якуб Колас” застаўся з ім на ўсё жыццё. У 1910 г. у Вільні выйшаў яго першы паэтычны зборнік “Песні жальбы”.

Паэма “Новая зямля” (1911-1923), ідэйная і жанравая задума якой была істотна пераасэнсавана і паглыблена, стала этапнай з’явай у творчасці Я.Коласа і ўсёй беларускай літаратуры. Тут з вялікай сілай мастацкага абагульнення адлюстраваны карэнныя сацыяльныя супярэчнасці канца 19 ст., намалявана шырокая эпічная панарама народнага жыцця, створаны тыповыя непаўторныя характары, раскрыта духоўная веліч, маральная прыгажосць чалавека працы, яго спрадвечная мара аб вольным шчаслівым жыцці, выяўлена імкненне стаць гаспадаром на ўласнай зямлі. Паэтычныя працы, эстэтызацыя сялянскага побыту, услаўленне чалавека-працаўніка, носьбіта лепшых рыс народнага,

Репозиторий ГрГМУ

нацыянальнага характару – наватарская рыса паэмы. У 30-я і пазнейшыя гады, калі пераважная большасць савецкіх пісьменнікаў выкрывала так званыя дробнаўласніцкія інстынкты селяніна, індывідуалістычную мараль, развенчвала яго кулацкія памкненні, Я. Колас паэмай “Новая зямля” з гонарам бараніў аўтарытэт прагожага пісьменства, годнасць мастака як выразніка інтарэсаў працоўнага сялянства. “Новая зямля” ўвайшла ў свядомасць чытача як найвыдатнейшы твор нацыянальнай літаратуры, з’ява нацыянальнай культуры, як паэтычная энцыклапедыя жыцця беларускага народа на новым этапе яго гістарычнага развіцця. Яна адыграла велізарную ролю ў сцвярджэнні прынцыпаў рэалізму, народнасці, у станаўленні ліра-эпічнай паэмы і празаічнага рамана.

За творы ваенных гадоў – кнігі “Адпомсцім”, “Голас зямлі” – Я. Коласу была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР.

У 1949 г. Я. Колас атрымаў другую Дзяржаўную прэмію СССР за паэму “Рыбакова хата”.

У 1954 г. ім была завершана заключная частка трылогіі “На ростанях”. Першыя дзве аповесці “У палескай глушы” і “У глыбі Палесся” былі напісаны яшчэ ў 20-я гады. Трылогія з’явілася не толькі самым значным творам пісьменніка, але адным з першых беларускіх раманаў. Я. Колас займаўся вершаванымі перакладамі на беларускую мову твораў А. Пушкіна, М. Лермантава, Т. Шаўчэнкі і іншых.

13 жніўня 1956 г. Якуб Колас памер.

У Беларусі свята ўшаноўваецца памяць аб народным песняры. Заснавана Дзяржаўная прэмія РБ імя Я. Коласа за лепшы празаічны твор. 1959 г. у Мінску быў адкрыты Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Я.Коласа. Існуюць мемарыяльныя сядзібы ў Акінчыцах, Смольні, Албуці, Ластку. У вёсцы Пінкавічы Пінскага раёна дзейнічае літаратурна-этнаграфічны музей Якуба Коласа. Імя народнага паэта носяць многія ўстановы Беларусі, а таксама вуліцы, плошчы і скверы ў розных населеных пунктах краіны. У гонар пісьменніка усталяваны шматлікія помнікі і абеліскі.

Багатая сучаснае сцэнічнае жыццё маюць не толькі драматычная творы Я.Коласа, але і п’есы, пастаўленыя паводле паэм, апавяданняў, аповесцей і трылогіі. Паводле аповесці “Дрыгва” кампазітарам А.Багатыровым створана адна з першых беларускіх нацыянальных опер “У пушчах Палесся”. Юрый Семяняка напісаў оперу “Новая замля”. На словы вершаў пісьменніка пісалі песні Ігар Лучанок, Мікалай Чуркін, Аляксей Туранкоў, Рыгор Пукст, Леў Абялевіч, Уладзімір Алоўнікаў, Уладзімір Мулявін. Па творах Я.Коласа былі зняты мастацкія фільмы “Першыя выпрабаванні”, “Новая зямля” і інш. Аб жыцці і творчасці пісьменніка створаны шэраг дакументальных фільмаў: “Народны паэт”, “Дзяцка Якуб” і інш. Творы – прысвячэнні Я.Коласу пісалі пісьменнікі: Вольга Іпатава, Генадзь Кляўко, Іван Чыгрынаў, Сяргей Грахоўскі. Мастакі, якія стваралі партрэты Я.Коласа і ілюстрацыі для яго твораў: Уладзімір Сулкоўскі, Аляксей Кручоных, Леанід Дударэнка, Ісак Давідовіч.

Репозиторий ГрГМУ

ЛІТАРАТУРА:
1. Колас, Я. Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас – Мінск, 1977. – 14 т.
2. Мацюх, М. Д. Колас Якуб. / М. Д. Мацюх, М. І. Мушынскі. – Беларускія пісьменнікі: Бібліягр. слоўн. у 6т., т. 3. – Мінск : Беларуская энцык., 1994. – 304 с.
3. Мушынскі, М. І. Коласазнаўства / М. І. Мушынскі. – Мінск, 1999. – 387 с.

# АСАБЛІВАСЦІ ПАЭЗІІ ЯКУБА КОЛАСА

**Макавецкая К. А.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
Навуковы кіраўнік – Варанец В. І.

“Мой родны кут, як ты мне мілы, забыць цябе не маю сілы…” – гэтыя словы нашага класіка ведае, бадай што, кожны беларус. Якуб Колас – Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч – адзін з заснавальнікаў беларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Шматграннасць яго таленту выявілася як у паэзіі, так і ў прозе, публіцыстыцы, у дзіцячай літаратуры. Якуб Колас па праву знаходзіцца на адным радку з Янкам Купалам. Гэта два таленавітыя чалавекі, якія нарадзіліся ў адзін год, жылі і стваралі ў адзін час, якія выпрабавалі як узлёты, так і моманты знявагі ад савецкай улады. І абодва стварылі сапраўдныя шэдэўры беларускай літаратуры.

Ужо ў 10-гадовым узросце Колас, пад уплывам баек Крылова, напісаў першы твор «Варона і ліса». У 12 гадоў стварыў першы верш «Вясна». Упершыню на беларускай мове спрабаваў пісаць падчас вучобы ў настаўніцкай семінарыі. На роднай мове былі напісаныя паэмы «Каля кастра» і «Страх», а таксама празаічны твор «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле». На жаль, гэтыя тэксты не захаваліся да нашага часу.

Паэтычная творчасць Якуба Коласа – гэта працяг дэмакратычных традыцый беларускай літаратуры мінулай эпохі. Паэт маляваў змрочную, прасякнутую сумам і жальбой карціну жыцця зняважанага і зняволенага мужыка. У яго першым вершы «Наш родны край», надрукаваным у 1906 г., і ў пазнейшых творах «Вёска», «Наша сяло», «Ворагам», «Мужык» і шмат іншых створана праўдзівая карціна старой жабрацкай Беларусі. Паэзія Я. Коласа была паэзіяй тугі і смутку. Невыпадкова свой першы зборнік вершаў паэт назваў «Песні жальбы» (1910). У ім многа лірычных, шчырых вершаў пра бацькаўшчыну, пра «забыты богам край». У 1923 годзе асобным выданнем выйшла скончаная паэма «Новая зямля», ў 1925 – 3-я рэдакцыя паэмы «Сымон-музыка», а ўжо ў 1926 Я. Колас атрымаў званне народнага паэта.

Якуб Колас адметна вылучаецца з кола паэтаў сваёй адданасцю роднаму краю, Бацькаўшчыне, служэннем свайму народу. Аднак даволі часта сустракаюцца меркаванні аб адсутнасці ў вершах паэта любоўных матываў, што, безумоўна, з’яўляецца памылковым сцвярджэннем. Вершы Якуба Коласа пра каханне ўяўляюць сабой адрасаваныя творы, у якіх абавязкова прысутнічае



Репозиторий ГрГМУ